ского типа. Усвоение содержания курса достигается путем использования проблемно – ориентированной системы подачи материала. Поэтому наряду с традиционными формами, такими как чтение лекций, проведение семинарских и практических занятий мы применяем и более современные приемы – использование презентаций, компьютерного тестирования, круглые столы, конференции, имеющие целью активизировать процесс обучения.

Изучение социальной экологии способствует развитию экологического сознания, которое включает понимание человеком окружающего мира, процессов, происходящих в нем, своих действий, мыслей, своего отношения к внешнему миру и к самому себе. Экологическое сознание предполагает не только знания о состоянии общества и природы, но и осознание необходимости предотвращения дальнейшего нарушения экологического равновесия в природе с целью сохранения природных элементов жизни человека. Оно проявляется в развитии чувства ответственности по отношению к другим людям и будущим поколениям.

ЛИТЕРАТУРА

1. Гирусов, Э.В. Экологическое сознание как условие оптимизации взаимодействия общества и природы /Э.В. Гирусов// Философские проблемы глобальной экологии.- М.1983.- С.105-120.
2. Дерябо, С.Д. Экологическая педагогика и психология/ С.Д.Дерябо, В.А.Ясвин.- Ростов-на-Дону: Феникс,1996.
3. Каропа, Г.Н. Парадигмальные сдвиги и новые тенденции в экологическом образовании школьников /Г.Н. Каропа. //Адукацыя и выхаванне, 2009, №9- С.15-21.
4. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 года. – Минск, 2004.

## ЗМЕСТ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ (канец XIX – пач. XX ст.)

**С.Р. Туболец**
*Віцебск, ВДУ*

Вядучыя педагогі мінулага і сучаснасці адзначаюць важнасць выхавання чалавека з мэтай захавання сувязі паміж старэйшым пакаленнем і яго нашчадкамі. Эстэтычнае выхаванне – істотная галіна сістэмы выхавання падрастаючага пакалення. Яно дазваляе захаваць і памножыць здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры, уяўляе сабой “мэтанакіраваны працэс фарміравання ў чалавека эстэтычных адносін да рэчаіснасці… Яно звязана з успрыяннем і разуменнем … прыгожага ў рэчаіснасці, асалодай ім, эстэтычнай творчасцю чалавека” [1].

Эстэтычнае выхаванне можа ўспрымацца як філасофская і педагагічная катэгорыя, бо ў яго працэсе адлюстроўваецца фарміраванне ў асобе эстэтычных адносін да рэчаіснасці (прыроды, працы, грамадскіх адносін, учынкаў людзей) і эстэтычнай дзейнасці. Да эстэтычнага выхавання можна падыходзіць і як да складанай філасофскай і грамадска-педагагічнай сістэмы, якая з’яўляецца часткай духоўнай культуры чалавека. Эстэтычныя адносіны чалавека да рэчаіснасці, што ўключаюць прыроднае і прадметнае асяроддзе, мастацтва, мае аб’ектыўныя заканамернасці, якія дастунныя асэнсаванню, вывучэнню і правільнаму выкарыстанню [2, 24].

Репозиторий ВГУ

Мы разглядаем эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы як выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага ў жыцці, якое з'яўляецца неабходным для працоўных; прывіццё на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы мае мэтанакіраваны характар, які склаўся пад уплывам назапашаных сацыяльна-культурных каштоўнасцей і звязаных з імі эстэтычнага ідэалу; ажыццяўляецца праз сістэму выхаваўчых уздзеянняў і ўплываў. Істотна, што мэта эстэтычнага выхавання адлюстроўвае абагульнены калектыўны вопыт выхавання, аднак у межах агульнага накірунку кожная сям'я ўносіла карэктывы на падставе асабістай эстэтычнай выхаванасці, асабістых уяўленняў аб выхаванні і памкненняў у жыцці. Агульная мэта эстэтычнага выхавання, на наш погляд, існавала як імкненне да дасягнення эстэтычнага ідэалу народа.

Дзеля дасягнення пастаўленай мэты народам выкарыстоўваліся разнастайныя метады ўздзеяння на асобу. Некаторыя з іх агульныя з метадамі, што прымяняюцца ў афіцыйнай педагогіцы (напрыклад, гутарка, назіранне, практыкаванне), аднак са сваімі асаблівасцямі напаўнення, сродкаў; некаторыя – спецыфічныя (наказ, грамадская думка, благаславенне).

Пры вывучэнні праблемы традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца X1X – пачатку XX стагоддзя, мы прыйшлі да высновы, што эстэтыка паводзін, быту, зносін, знешняга выгляду, моўнай культуры будавалася на падставе сфарміраванага эстэтычнага ідэалу з дапамогай разнастайных сродкаў і метадаў, прыстасаваных да мэт эстэтычнага выхавання.

Такім чынам, змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы вынікае з узаемадзеяння метадаў выхавання на падставе традыцыйных сродкаў. Працэс эстэтычнага выхавання згодна з узроставымі асаблівасцямі, доўжыцца праз усё жыццё, хаця асноўная перавага надаецца менавіта дзяцінству-падлеткавасці-маладосці. У пэўным узроставым перыядзе прэвалююць тыя ці іншыя метады эстэтычнага выхавання, скіраваныя на фарміраванне адпаведна непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычных перажыванняў, эстэтычных густаў, ацэнак, арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці. Інакш кажучы, мы бачым прыярытэтную скіраванасць тых ці іншых метадаў у розныя ўзроставыя адрэзкі.

У маленстве (ад нараджэння да 6-8 гадоў) галоўнымі паўстаюць метады фарміравання непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці: назіранне, растлумачэнне, перакананне, якія рэалізуюцца праз выкарыстанне калыханак, пацешак, забаўлянак, лічылак. Ва ўзросце "блазнюкоў" з'яўляюцца гульні, прыклад якіх – працоўная дзейнасць і сама праца. Ад 6-8 да 12-14 гадоў эстэтычае выхаванне скіравана на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. Дзеці прывучаюцца рабіць усё, крытэрый якасці – прыгажосць. Вядзецца расповед, гутарка, дзеці ўводзяцца ў кола казак, загадак, прымавак і прыказак, гуляюць у гульні, крыніца якіх – працоўны працэс. Падлеткавы ўзрост – ад 12-14 да 16-17 гадоў аб'ядноўвае папярэдні і наступны перыяды, характаразуецца пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. Умоўныя межы з 16-17 да 19-20 год – арганізацыя эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая ідзе праз працу, святы, абрады, традыцыі.

Метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы накіраваны на ўнутраны свет асобы (інтравертаваныя), альбо ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (экстравертаваныя).

Рух да найвышэйшай прыгажосці ажыццяўляецца з дапамогай традыцыйных

Рэпазіторый ВДУ

сродкаў і метадаў, паступова ўдакладняючы і развіваючы ідэю вышэйшай сацыяльнай прыгажосці; ён скіраваны на развіццё рыс і якасцей асобы, спалучаных з народным эстэтычным ідэалам.

Да сродкаў эстэтычнага выхавання мы адносім гульню, працу і рамёствы, мову, народную творчасць, традыцыі, святы, звычаі, абрады, зносіны, лазню, арганізацыю прасторавага асяроддзя пражывання, рэлігію, прыроду – усе тыя галіны творчасці і жыццядзейнасці народа пры дапамозе якіх ідзе эстэтычнае ўздзеянне на асобу.

Аналіз народнага вопыту выхавання і творчасці дае падставы вылучаць такія пашыраныя метады эстэтычнага выхавання, як прыклад і аўтарытэт, гульня, унушэнне, перакананне, прывучэнне, практыкаванне, праца, назіранне, грамадская думка, заахвочванне, ухваленне і асуджэнне, вымовы,пасядзелкі, вячоркі, тлумачэнне, гутарка, запалохванне, зварот да эстэтычнага пацуцця, узаемная павага, агульная эстэтыка паводзін.

Такім чынам, мы бачым рэалізацыю зместа эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы праз сістэму метадаў, што выкарыстоўваюцца ў гэтым працэсе. Яны ўсе ўзаемазвязаныя і ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго (метады, скіраваныя на ўспрыняцце і паразуменне прыгажосці і метады, скіраваныя на фарміраванне і развіццё уменняў будаваць і захоўваць прыгажосць).

Існуе пэўная спецыфічнасць выкарыстання традыцыйных метадаў народнай педагогікі на падставе адвечных сродкаў выхавання ў розныя ўзроставыя перыяды. У маленстве ідзе фарміраванне непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці. Дзяцінства адметна метадамі эстэтычнага выхавання, што скіраваны на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. Падлеткавы ўзрост аб'ядноўвае папярэдні і наступны перыяды, характарызуецца пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. Юнацтва – час арганізацыі эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая ідзе праз працу, святы, абрады, традыцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Лихачёв, Б.Т. Теория эстетического воспитания школьников / Б.Т. Лихачёв. – М.: Просвещение, 1985. – 175 с.
2. Джантотаева, М.Э. Влияние этнопедагогических знаний на эстетическое воспитание младших школьников: дис. … канд. пед. наук: 13. 00. 01 / М.Э. Джантотаева; Карачаевский гос. ун-т. – Карачаевск, 2000. – 208 с.

## БЕЗОПАСНАЯ БОЛЬНИЧНАЯ СРЕДА КАК ФАКТОР ОБЕСПЕЧЕНИЯ ЭФФЕКТИВНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ МЕДИЦИНСКИХ СЕСТЕР

**А.В. Цецохо, В.В. Ольшанникова**
*Витебск, ВГМК*

«Завтра, как и сегодня, медик сохранит свой сан жреца, а вместе с ним и свою возрастающую ответственность, и жизнь его останется такой же, как сегодня: трудной, тревожной, героической и возвышенной. Так помоги Вам Бог, даруя здоровье и Вам!» А.Моруа.

Целью работы являлось привлечь внимание к важности изучения проблемы по сохранению здоровья среди медицинских работников, рассмотреть профессиональные факторы риска медицинского персонала, познакомить с современными эргономиче-

Репозиторий ВГУ